**А. А. Макарэвіч**

# АЎТАРСКАЯ КАЗКА Ў СУЧАСНАЙ ІСПАНСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ

Аўтарская казка – адзін з важнейшых жанраў дзіцячай літаратуры, які захоўвае адметнсці фальклорных твораў (перадача асноўных маральных каштоўнасцей, правіл паводзін), а таксама адлюстроўвае актуальныя праблемы грамадства. У дадзеным даследаванні прааналізаваны жанравыя асаблівасці сучаснай літаратурнай казкі на прыкладзе "Зборніка ілюстраваных казак" іспанскіх пісьменнікаў і зборніка Ганны Янкуты "Марта і яе мара пра снег".

Асаблівасці праблемна-тэматычнага поля. У зборніку іспанскіх казак галоўная ўвага надаецца праблеме ўзаемаадносін паміж пакаленнямі, а менавіта паміж унукамі і іх бабулямі і дзядулямі; мірнага суіснавання розных народаў; закранаецца тэма прыроды; асноўнымі маральнымі арыенцірамі застаюцца блізкія сямейныя адносіны, сяброўства, роўнасць. У беларускіх аўтарскіх творах раскрываюцца экалагічныя праблемы, узаемаадносіны паміж дзецьмі і бацькамі. Цэнтальнай у зборніку становіцца тэма людзей з абмежаванымі магчымасцямі і праблемы, з якімі яны сутыкаюцца, такія як негатыўнае стаўленне, адсутнасць неабходнага гарадскога абсталявання, недастатковая дасведчанасць людзей аб іх здольнасцях і патрэбах, адзінота.

Сюжэтна-кампазіцыйныя адметнасці. Літаратурная казка не абмежаваная строгімі правіламі пабудовы: могуць адсутнічаць цэлыя кампазіцыйныя часткі, абавязковы для народных казак шчаслівы фінал, амаль не выкарыстоўваюцца традыцыйныя формулы зачыну (*жыў-быў, даўным-даўно* або *había una vez* 'было аднойчы', *este era* 'гэта быў') і прыказкі ў пачатку або

ў канцы твора (выключэнне – М. Х. Аргуэлье Мартынес “Птушка, якая не хацела летаць”).

Жанравыя асаблівасці. У літаратурных казках ролі галоўных герояў выконваюць дзеці, адсутнічае строгі падзел на станоўчых і адмоўных персанажаў, часта парушаецца закон перамогі дабра над злом і статычнасць герояў: адзначаецца як эвалюцыя (Уладарка Вятроў), так і дэградацыя характараў (воўк Вольфі). Характэрнай адметнасцю сучасных твораў лічыцца адлюстраванне сродкаў тэхналагічнага працэсу, якія становяцца прычынай галоўнага канфлікту (“Марта і яе мара пра снег”).

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў цэнтры сюжэту як іспанскіх, так і беларускіх аўтарскіх казак паўстаюць актуальныя сацыяльныя і экалагічныя праблемы: прыродныя катаклізмы, узамаадносіны паміж пакаленнямі, неабходнасць догляду прыроды з боку чалавека, пагрозы навукова-тэхналагічнага прагрэсу. Галоўнымі маральнымі каштоўнасцямі застаюцца сям’я і сяброўства. Адметнасцю іспанскіх твораў з’яўляецца зварот да полікультурнага выхавання дзяцей, у той час як у беларускіх казках большая ўвага надаецца тэме людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Да асаблівасцей сюжэтна-кампазіцыцнай пабудовы аўтарскай казкі адносяцца адсутнасць традыцыйных ініцыяльных формул, прыказкі і абавязковага шчаслівага фіналу.